# РАЗДЕЛ 1. АКТУАЛЬНЫЕ ПРОБЛЕМЫ СОЦИАЛЬНО-ГУМАНИТАРНЫХ НАУК

## АБ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫМ РАЗВІЦЦІ БЕЛАРУСІ Ў XVI–XVIII СТСТ.: АСНОЎНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ

**А.Я. Барсук, В.В. Старавойт**
*(Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І. П. Шамякіна)*

МГПУ им. И.П.Шамякина

Рэлігія і Царква, як яе арганізацыйны інстытут, у сярэднявечнай Еўропе займалі пануючае месца ў дзяржаве і грамадстве, вызначалі ўнутраную і знешнюю палітыку дзяржавы, кіравалі адукацыяй і судаводствам, фарміравалі светаўспрыманне і светапогляд чалавека. На пачатку XVI ст. у Еўропе назіраецца аслабленне ўплыву Царквы на грамадства, што было абумоўлена новымі гістарычнымі ўмовамі, перш за ўсё, развіццём навуковых ведаў і грамадскай думкі, новым узроўнем вытворчасці і сацыяльна-эканамічных адносін. Найбольш яскравым праяўленнем крызісу Царквы стала Рэфармацыя, вядучыя дзеячы якой прапагандавалі неабходнасць перагляду жыцця духавенства, выканання раннехрысціянскіх запаветаў. На самой справе рэфармацыйны рух акрэсліваў сацыяльныя, палітычныя, эканамічныя супярэчнасці сучаснасці, вызначаў ідэалагічныя сродкі, шляхі іх вырашэння праз рэлігійную форму, найбольш зразумелую тагачаснаму чалавеку.

У XVI ст. беларускія землі апынуліся пад уплывам эпохі Рэнесансу і Рэфармацыі, але значна пазней, чым у краінах Заходняй Еўропы. Эпоха Адраджэння, або Рэнесанс, вызначыла новую складаную і спецыфічную з'яву і сістэму поглядаў, якая сцвярджала свабоду і годнасць чалавека, – гуманізм. Менавіта гуманісты заклалі падмурак Рэфармацыі і секулярызацыі культуры. На пачатак XVI ст. у Вялікім Княстве Літоўскім склаліся перадумовы для станаўлення культуры Рэнесанса. Беларусь была ўдзельнікам агульнаеўрапейскага культурнага працэсу, але мела спецыфічныя рысы: талерантнасць, зараджэнне мецэнацтва, пераемнасць візантыйскіх і старажытнарускіх праваслаўных традыцый і ўплыў заходнееўрапейскіх тэндэнцый, суіснаванне новых і кансерватыўных ідэй Сярэднявечча і Адраджэння.

Рэфармацыйныя і гуманістычныя ідэі пранікалі ў Каралеўства Польскае і Княства Літоўскае, пазней Рэч Паспалітую ў выніку пашырэння міжнародных сувязей у палітыцы, культуры, адукацыі і зрабілі вялізарны ўплыў на грамадска-палітычнае жыццё дзяржавы. Шляхта атрымлівала адукацыю ў еўрапейскіх універсітэтах. Распаўсюджанню вальнадумства, культуры італьянскага Адраджэння і спрыяла асяроддзе каралеўскага двара пасля шлюбу Жыгімонта І Старога на італьянскай каралеўне Боне Сфорца. Спаведнік каралевы Боны Франчэска Лісманін быў прыхільнікам антытрынітарызму. Капеланы Жыгімонта ІІ Аўгуста

Ян Казмінчык і Ваўжынец Пражніцкі адкрыта выступалі з крытыкай каталіцкай дактрыны [1, с. 12].

Ідэі гуманізму змянялі характар і спосаб мыслення грамадскай эліты, пашыралі вальнадумства, зацвярджалі неабходнасць асветы і адначасова захавання ўласнай ідэнтычнасці. Тагачасны светапогляд чалавека характарызаваўся абавязковай наяўнасцю сакральнага, што тлумачыць вялізную ролю рэлігіі ў штодзённым жыцці грамадства. Рэфармацыя прывяла да пашырэння пратэстантызму ў Польшчы і Літве, разладжвала вераванні, выклікала абыякавасць і вальнадумства, нанесла шкоду і каталіцтву, і праваслаўю [2, с. 19, 43–44]. Рэфармацыя імкнулася аднавіць адзінства сакральнага на аснове Бібліі. Аднак у выніку рэформ царквы Еўропа страціла канфесійную еднасць і салідарнасць хрысціянскага свету, выклікала Контррэфармацыю і рэлігійныя войны, набыла неабходнасць новага разумення талерантнасці. На думку многіх даследчыкаў, менавіта гэтыя абставіны, падмацаваныя заняпадам царкоўна-славянскай асветы, падпарадкаваннем праваслаўнага духавенства свецкай уладзе, крызісам Кіеўскай мітраполіі і Канстанцінопальскага патрыярхату, увогуле абумовілі магчымасць заключэння Берасцейскай царкоўнай уніі 1596 г. [3, с. 250].

Каталізатарам аб’яднаўчых працэсаў стала стварэнне Маскоўскага патрыярхату ў 1589 г. і пашырэнне ідэй – “Масква – трэці Рым”, прадвызначанасці ў абароне праваслаўя. Аднак міжканфесійную ўнію 1596 г. нельга разглядаць толькі як вынік супрацьстаяння “каталікі – праваслаўныя”. Гэта былі наступствы ўплыву Рэнесансу, Рэфармацыі і Контррэфармацыі. Неспрыяльныя ўмовы для функцыянавання праваслаўнай царквы ў Рэчы Паспалітай у XVI ст. не вызначалі страту яе пазіцый у грамадскім жыцці. Пашырэнне ўплыву каталіцтва і павелічэнне колькасці вернікаў-каталікоў на беларускіх землях у складзе Рэчы Паспалітай не абмяжоўваліся толькі гэтай акалічнасцю. Вялікую ролю адыгралі ідэі Рэфармацыі, гуманізму і вальнадумства, а таксама інкарпарацыя праваслаўнай эліты ў польскую шляхту шляхам прыняцця каталіцтва і пераймання польскай культурнай традыцыі як магчымасць атрымаць дадатковыя прэферэнцыі ці рэалізаваць уласныя амбіцыі. Рэфармацыйныя накірункі, асабліва кальвінізм, атрымалі даволі значнае пашырэнне на тэрыторыі Беларусі, аднак, у адрозненне ад Заходняй Еўропы, пераважна сярод магнатаў і часткі шляхты. Адным са станоўчых вынікаў Рэфармацыі ў ВКЛ і Рэчы Паспалітай стала заканадаўчае замацаванне свабоды веравызнання – спачатку ў Віленскім прывілеі Жыгімонта II Аўгуста 1563 г. і II Статуце ВКЛ 1566 г. Затым верацярпімасць заканадаўча была замацавана ў Акце Варшаўскай канфедэрацыі 1573 г., поўны тэкст якога быў уключаны ў III Статут ВКЛ [4, с. 118–120; 5, с. 38–39]. На думку ўкраінскага даследчыка І. Чахоўскага, гэтая прававая норма стала пэўнай падставай для падтрымання праваслаўнай шляхтай умоў Берасцейскай уніі [6, с. 17]. Падчас наступу Контррэфармацыі былая праваслаўная шляхта на беларускіх землях, што

МГПУ им. И.П. Шамякина

падтрымала пратэстантызм, перайшла ў каталіцтва. Зразумела, што гэта адмоўна адбілася на станаўленні нацыянальнай царквы і адпаведна на фарміраванні нацыянальнай ідэнтычнасці [3, с. 253]. Акрамя таго, у выніку пашырэння ўніяцтва на пачатку XVII ст. быў фактычна ліквідаваны прынцып верацярпімасці, што абвастрыла міжканфесійныя супярэчнасці і стварыла магчымасць выкарыстання лозунга абароны “веры продкаў” у палітычнай барацьбе розных сацыяльных сіл. Так, казацтва адкрыта выступіла ў абарону праваслаўя. Канфесійныя супярэчнасці выклікалі палітычнае, сацыяльнае і культурнае супрацьстаянне ў Рэчы Паспалітай і за яе межамі. Таму праціўнікі ўніі пачалі разлічваць на падтрымку і абарону сваіх інтарэсаў з боку аднаверцаў – Маскоўскай дзяржавы, што, у сваю чаргу, абумовіла абвастрэнне канфрантацыі паміж дзяржавамі не толькі ў знешнепалітычным аспекце, але і сацыякультурным – сутыкненне дзвюх цывілізацый – заходняй і ўсходняй. Рэч Паспалітая – шматэтнічная і поліканфесійная дзяржава з перавагай лацінскага рацыяналізму і пашырэннем ідэй гуманізму і вальнадумства. Руская дзяржава – маналітная аўтакратыя з саборнасцю, містычнай набожнасцю і неаформленым фальклорам [3, с. 255]. Канфесійнае пытанне выкарыстоўвалася ў якасці “баявога сцяга” падчас ваенных падзей 1648–1654 гг. і 1654–1667 гг. На Беларусі і Украіне і напярэдадні падзелаў Рэчы Паспалітай, падчас стварэння Торуньскай пратэстанцкай і Слуцкай праваслаўнай канфедэрацый у 1767 г., што дазволіла іншаземцам умяшацца ва ўнутраныя справы Рэчы Паспалітай.

Падзеі 1648–1667 гг. з’явіліся дэмаграфічнай катастрофай, наступствы якой не былі пераадолены нават да канца XVIII ст. Беларусы сталі народам з няпоўнай сацыяльнай структурай [7, с. 93]. Адбыўся таксама сацыякультурны раскол грамадства на два паралельныя накірункі: статычную народную культуру, заснаваную на традыцыйным ладзе жыцця, і шляхецкую, арыентаваную на дасягненні заходнееўрапейскай думкі і асветы. У такіх умовах галоўную камунікацыйную ролю павінна выконваць мова, якая адначасова дазваляе захоўваць уласную ідэнтычнасць, вызначаць сваіх і чужых, акрэсліваць сваю адметнасць [8, с. 13–14]. Інакш кажучы, асноўнымі фактарамі фарміравання культурнай ідэнтычнасці з’яўляюцца: традыцыі і ўяўленні; этнагенетычныя міфы (пра паходжанне, гісторыю, культуру), усведамленне адзінства грамадства і яго самабытнасці, тэрытарыяльных і сацыякультурных межаў, наяўнасць агульнай рэлігіі і мовы зносін; уяўленні пра “іншае”, яго параўнанне ці супрацьпастаўленне [3, с. 261].

Неабходнасць узаемадзеяння на памежных тэрыторыях вызначала магчымасць выпрацоўкі новых форм салідарнасці, але і захавання ўласнай самабытнасці ці супрацьстаяння “іншаму”, што садзейнічала фарміраванню асобнага геаграфічнага субрэгіёна. Некаторыя даследчыкі вызначаюць беларусаў як нацыю памежжа [9; 10]. Такім чынам, можна казаць пра тое, што беларуская культура на працягу стагоддзяў знаходзілісся пад уплывам рознанакіраваных сацыяльна-палітычных, канфесійных, філасофска-

МГПУ им. И.П.Шамякина

прававых накірункаў. Вялікую ролю адыгрывалі ў традыцыйнай культуры беларусаў сакралізацыя мадэлі свету і міфалагізацыя этнічнай гісторыі, што найбольш яскрава вызначаюцца ў вуснай народнай творчасці і мастацкіх творах [3, с. 264].

Ідэалогія сарматызму таксама адыграла значную ролю ў самавызначэнні "рускага народу" ў Рэчы Паспалітай і вызначала стыль жыцця і спосаб мыслення шляхты Рэчы Паспалітай (Вялікай Сарматыі), дзяржавы вольнасцей шляхецкіх. Першым хранiстам, які скарыстаў паняцце Сарматыя, быў Ян Длугаш [11, с. 91]. Ян Вісліцкі сваю паэму "Пруская вайна" прысвяціў "непераможнаму каралю еўрапейскай Сарматыі" Жыгімонту I Старому [12, с. 339].

Назва "Сарматыя" выкарыстоўваецца ў творах Бернарда Вапоўскага, Мацея Мехавіты (Мяхоўскага), Аляксандра Гваньіні і інш. [13, с. 65, 66, 96]. Росквіт сарматызму супаў па часе з панаваннем мастацкага стылю барока, суіснаваў разам з ім у мастацтве і літаратуры. Але сарматызм пашырыўся толькі сярод шляхты, стаў палітычнай ідэалогіяй, паўплываў на звычаі і лад жыцця. Склаўся агульны ўзорны вобраз сармата – патрыёта сваёй дзяржавы і шляхецкага стану, храбрага рыцара, красамоўнага аратара, абаронцы грамадскіх інтарэсаў незалежна ад уласных амбіцый, гасціннага, шчырага, годнага, свабоднага чалавека, перакананага ў сваёй культурнай, палітычнай і нацыянальнай выключнасці. Большая частка шляхты, пераважна сярэдняй і дробнай, прытрымлівалася адных і тых перакананняў, грамадскіх і палітычных поглядаў, цытавала тых жа аўтараў. Агульныя шляхецкія прывілеі, удзел у адзіных формах палітычнага жыцця, уніфікацыя адукацыі абумовілі выпрацоўку агульнай ментальнасці і ідэалогіі незалежна ад этнічнай, канфесійнай прыналежнасці і маёмаснага стану. Сфарміраваўся міф аб выключнай ролі Рэчы Паспалітай у абароне хрысціянскіх каштоўнасцей [7, с. 150].

Эстэтычныя канцэпцыі барока адпавядалі светапогляду чалавека, які існаваў у час сацыяльна-палітычных і рэлігійных супярэчнасцей. У адрозненне ад готыкі і рэнесанснага стылю, што з'явіліся ў Беларусі са значным спазненнем, барока пашыраецца амаль адначасова з краінамі Заходняй Еўропы і ўвасабляецца ў своеасаблівым спалучэнні і заходняй, і візантыйскай традыцый, і прыстасоўваецца да мясцовых самабытных асаблівасцей [7, с. 66].

Беларускія землі ў складзе Рэчы Паспалітай у XVIII ст. апынуліся пад культурным уплывам эпохі Асветніцтва, што ўсталёўвала неабходнасць асветы, рацыянальнасці ў адносінах да свету і рэлігіі. Гэта быў час рэвалюцыйных змен у жыцці і свядомасці еўрапейцаў, секулярызацыі культуры, пераасэнсавання поглядаў на прыроду, грамадства і чалавека, успрымання ідэй натуральнага права, свабод чалавека і грамадзяніна. Пашыраецца ідэя ўсемагутнасці асветы і навукі, закладваецца падмурак для нацыятворчых працэсаў.

МГПУ им. И.П.Шамякина

Такім чынам, сацыякультурнае развіццё беларускіх зямель у XV–XVIII стст. адбывалася ў агульнаеўрапейскім кантэксце, але мела мясцовыя асаблівасці.

**Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры**

1. Грушевський, М. С. Історія української літератури : в 6 т. 9 кн. / М. С. Грушевський ; упоряд. О. В. Дідух, приміт С. К. Росовецького. – Кіев : Либідь, 1995. – Т. 5. Кн. 2. – 352 с.

2. Левицкий, О. Предисловие / О. Левицкий // Архив Юго-Западной России, издаваемый временной комиссией для разбора древних актов, состоящей при Киевском, Подольском и Волынском генерал-губернаторе. – 1883. – Ч. 1. Т. 6 : Акты о церковно-религиозных отношениях в Юго-Западной Руси (1322–1648 гг.). – 939 с.

3. Калакура, Я. С. Українська культура: цивілізаційний вимір / Я. С. Калакура, О. О. Рафальський, М. Ф. Юрій. – Киев : ІПіЕНД ім. І. Ф. Кураса НАН України, 2015. – 496 с.

4. Акты, относящіеся к исторіи Западной Россіи, собр. и изд. археогр. Коммиссіею : в 5 т. – СПб. : Тип. Э. Праца, 1846–1853. – Т. 3 : 1544–1587. – 1848 с.

5. Статут Вялікага княства Літоўскага 1566 г. / уклад. Т. І. Доўнар, У. М. Сатолін, Я. А. Юхо ; рэдкал.: Т. І. Доўнар [і інш.]. – Мінск : Тэсей, 2003. – 352 с.

6. Чеховський, І. На шляху довіротерпимості: Варшавська конференція 1573 р. / І. Чеховський // Час. 2000. – 2004. – 29 квітня. – С. 17.

7. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / Ю. Бохан [і інш.] ; рэдкал.: М. Касцюк [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2004. – Т. 3 : Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.). – 344 с.

8. Нагорна, Л. Національна ідентичність в Україні / Л. Нагорна. – Киев : ІПіЕНД НАН України, 2002. – 271 с.

9. Кравцевич, А. Белорусы: нация Пограничья / А. Кравцевич, А. Смоленчук, С. Токть. – Вильнюс : ЕГУ, 2011. – 212 с.

10. Криволап, А. Культурная идентичность в контексте Пограничья. Конструирование белорусского медиаландшафта / А. Криволап, Е. Матусевич. – Вильнюс : ЕГУ, 2008. – 230 с.

11. Дорошкевич, В. И. Новолатинская поэзия Белоруссии и Литвы / В. И. Дорошкевич. – Минск : Наука и техника, 1979. – 208 с.

12. Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы ; падрыхт А. І. Богдан [і інш.] ; навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – 2 -е выд., выпр. – Мінск : Бел. навука, 2005. – 1015 с.

13. Семянчук, А. А. Беларуска-літоўскія летапісы і польскія хронікі / А. А. Семянчук. – Гродна : ГрДУ, 2000. – 161 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина